***В. С. Галаўко***
*Навуковы кіраўнік*
***А. М. Аксёнаў***
*Беларускі гандлёва-эканамічны*
*ўніверсітэт спажывецкай кааперацыі*
*г. Гомель, Рэспубліка Беларусь*

# ТРАДЫЦЫІ МАЛОЙ РАДЗІМЫ: АБРАДЫ «ПЕРАНОС СВЯЧЫ» І «СВЯЧА» Ў КАЛІНКАВІЦКІМ РАЁНЕ ГОМЕЛЬСКАЙ ВОБЛАСЦІ

З даўніх часоў праваслаўныя хрысціяне святкуюць свае рэлігійныя святы. Гэта перадаецца з пакалення ў пакаленне. Як і ў кожнага чалавека, у вёскі таксама ёсць душа. Гэта яе святы, якія збіраюць радню, сяброў, жыхароў і людзей, якія жывуць у іншых мясцінах. На нашым Палессі ў кожнай вёсцы было сваё стольнае свята. У святочны дзень прыязджала ў госці радня. Гаспадары рыхтаваліся загаддзя, чакалі і сустракалі гасцей, ладзілі свята. Гэта быў важны час зносін з блізкай раднёй. Паехаць у суседнюю вёску на конях ці пайсці пешшу пасля хатніх спраў – гэта было абавязкова. Гасцей заўсёды чакалі і былі рады сустрэчы.

Спакон веку ў нашых вёсках асабліва адметна святкавалі Тройцу і Успенне Багародзіцы: ў Навінках – Тройцу, Залатусе – Успенне Багародзіцы. Веруючыя стварылі сваю нематэрыяльную каштоўнасць – гэта абрады «Свяча» і «Перанос свячы». Духоўнае зерне, каштоўнае для кожнага чалавека, пакінулі нам продкі. Закладзеныя імі традыцыі жывуць у Навінках і Залатусе па сённяшні дзень. У Навінках абрад «Перанос свячы» праходзіць на другі дзень Тройцы, у Залатусе – прымеркаваны да Успення Прасвятой Багародзіцы, што святкуецца 28 жніўня. Абрад праводзіцца ў вёсках аднолькава. Свята атрымліваецца ціхае, благаснае, трапяткое.

Вельмі добра, што самабытная традыцыя мае працяг. Радуе тое, что маладое пакаленне падтрымлівае і захоўвае праваслаўныя традыцыі, прапускае праз сябе духоўныя каштоўнасці славян, імкнецца больш даведацца аб важнейшых рэлігійных святах, шукае дарогу да веры, духоўна ўзбагачае сябе.

Відавочная каштоўнасць абраду ў тым, што ён яднае вясковую супольнасць. Кожны год (нават ужо цяжка сказаць, колькі дзесяцігоддзяў запар) у Навінках і Залатусе спраўна прытрымліваюцца традыцыі. Людзі з’язджаюцца на свята самі і без усялякага прымусу робяць яго сабе. Гэта сапраўды добрая, шчырая традыцыя, якая перадаецца з пакалення ў пакаленне.

Дзень святой Тройцы (Пяцідзясятніца, Спасланне Святога Духа, Сёмуха) – свята, якое ўваходзіць у праваслаўі ў лік двунадзясятных. У яго аснове – аповед аб зыходжанні Святога Духа на апосталаў на пяцідзясяты дзень пасля Вялікадня. А Успенне Багародзіцы святкуецца 28 жніўня. Згодна з царкоўным паданнем, у гэты дзень апосталы, якія прапаведвалі хрысціянскую веру ў розных краінах, цудам сабраліся ў Іерусаліме, каб развітацца і здзейсніць захараненне Багародзіцы – Дзевы Марыі. На момант смерці яна пражывала ў Іерусаліме, наведвала для малітваў Галгофу і Труну Гасподню.

Сваёй царквы ў вёсках Навінкі і Залатуха няма, і яны адносяцца да прыходу храма Свяціцеля Мікалая, што ў суседніх Васілевічах. Айцец Георгій ніколі не пакідае сваіх прыхажан без увагі і заўсёды падтрымлівае традыцыі і абрады мясцовых жыхароў. У даўніну нашы продкі з вялікай павагай ставіліся да агню. Сямейны ачаг, агонь у печы амаль што абагаўляліся. Культавую, глыбока сімвалічную ролю выконваў у беларускім сялянскім побыце таксама агонь свечак і лучыны. Агонь шанавалі з даўніх часоў, яму прыносілі ахвяры. Менавіта агонь быў найгалоўнейшым боствам для старажытных людзей. Яго берaглі як сваё вока. Сапраўды, свечка і агонь наогул як крыніца святла карысталіся ў беларусаў асобай павагай, і свята свечкі святкавалі некалькі разоў на год. Не было для нашых продкаў большай патрэбы (ды і радасці), калі праходзіў абрад «Свяча» на Гомельшчыне, а менавіта ў нашых вёсках. Раз на год ікону – «Свячу» – пераносілі з хаты ў хату. Пра гэта дамаўляліся загадзя. На працягу некалькіх гадоў ікона «абыходзіла» ўсю вуліцу. У вёсках звычайна было некалькі ікон – «свеч». Калі ж свячу не забіралі, яна заставалася ў адной хаце некалькі гадоў.

Доўгажыхарка в. Залатуха Наталля Фёдараўна Жук апавядае, што ў даваенны час ікона «Свяча» знаходзілася ў Васілевіцкай царкве. На свята Прачысты яе на тыдзень прыносілі ў вёску. У былыя гады ікону ў свята Прачысты насілі па ўсёй вёсцы і ў кожны двор. Гаспадары двара сустракалі «Свячу» хлебам-соллю. Пасля хрэснага ходу па вёсцы ікону неслі пешшу 12 кіламетраў у Васілевіцкую царкву. Пасля вайны жыхары вёскі сабралі грошы і выкупілі ікону Божай маці для Залатухі. Цяпер яна – уласнасць вёскі, захоўваецца ў аднаго са старажылаў.

Да свята «Свячы» жыхары рыхтуюцца загадзя: ва ўсіх хатах мыюць, прыбіраюць, чысцяць падворкі. За дзень-другі да свята жыхары ходзяць па вёсцы і збіраюць кветкі. Гаспадар дома, які збіраецца прыняць да сябе ікону Божай Маці, едзе ў царкву і дагаворваецца з бацюшкам аб часе яе пераносу. Напярэдадні свята, увечары, вяскоўцы прыходзяць «на Свячу», моляцца, спяваюць акафісты, «псальмы», духоўныя вершы, вячэраюць і разыходзяцца. А з раніцы вяскоўцы-жанчыны і дзяўчаты збіраюць букеты. Прыязджае святар і правіць службу. Пасля гэтага ікону-«Свячу» і «свячу» вясковую выносяць з дому. Наперадзе грамады ідзе чалавек, які нясе запаленую свечку. Побач нясуць хлеб-соль на ручніку. А адзін са старэйшых жыхароў вёскі нясе драўляны крыж.

На другі дзень Тройцы насельніцтва вёскі Навінкі павялічваецца разы ў тры. Ураджэнцы вёскі, іх дзеці і родзічы з’язджаюцца адусюль, каб узяць удзел у старадаўнім абрадзе «Перанос свечкі». Упершыню абрад пераносу свечкі згадваецца ў Іпацьеўскім летапісе 1159 г. У яго аснове, як зазначаюць этнографы, адначасова ёсць элементы паганства і хрысціянства. Першапачаткова – пакланенне агню як духу продкаў, з праваслаўем — своеасаблівы зварот да Збавіцеля.

Агонь быў багаццем для славян, яго бераглі як зрэнку вока. І не было для нашых продкаў большай патрэбы дый радасці, калі дзяліліся «сваім» агнём з блізкімі, з суседзямі. Гэта пацвярджае перанос свечкі ў Навінках. Сутнасць абраду ў тым, што яе разам з іконай і вясковым крыжом на працягу года захоўваюць у адной хаце, затым урачыста пераносяць у іншую. Хата, дзе гарыць «свечка», на год становіцца своеасаблівым вясковым храмам. Любы чалавек можа прыйсці сюды, каб памаліцца, папрасіць дапамогі, падтрымкі ў святынь. Гаспадарам нельга нікому адмаўляць, бо гэта лічыцца вялікім грахом.

У наш час панавання электрычнасці хрысціянская царква захоўвае традыцыю рытуальнай свечкі. Нас прыцягвае і заварожвае трапятанне жывога агню з яго магічнай гульнёй. І гэта родніць сучаснага чалавека з яго далёкімі, мудрымі продкамі.

Дарэчы, у гэтым годзе вяскоўцы распачалі працу па ўнясенні абраду ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей краіны. 2018 год у Беларусі аб’яўлены Годам малой Радзімы. Прыйшоў час кожнаму не толькі ўспомніць пра свае карані, пра месца, дзе засталася часцінка душы, але і аддаць доўг гэтаму кавалачку зямлі.